ВЫСТАЎКІ

# МАСТАЦТВА, ЯКОЕ ЗВЕРНУТА ДА ЛЮДЗЕЙ

Калі мастак здолеў данесці перажытае ім пачуццё да гледача, пераўтварыць яго ў мастацкі твор, тады і адбываецца вялікі цуд мастацтва — цуд эмацыянальнай усхваляванасці і суперажывання. Менавіта такое адкрытае, тонкае і сапраўднае пачуццё жыве ў творах гродзенскага скульптара У. Церабуна, якія мы ўбачылі на яго персанальнай выстаўцы. Настрой гэтых твораў народжаны рознымі пачуццямі — ад узнёслай і бесклапотнай радасці да задуменнай самапаглыбленасці і горкага няўцешнага смутку.

Значнае месца ў творчасці мастака займае тэма вайны. Можна сказаць, што ў Церабуна яна падкрэслена прыземленая, а дакладней, прыведзеная ў та. кі стан, калі яна становіцца зразумелай і блізкай кожнаму чалавеку. Гэта ў аднолькавай ступені датычыцца і буйнага мемарыяльнага ансамбля «Дальва», і маленькай скульптурнай кампазіцыі «Зноў пра вайну». Адна з характэрных асаблівасцей аўтарскай трактоўкі тэмы — уменне ў звычайным і непрыкметным паказаць велічнае і трагічнае, у трагедыі аднаго чалавека ўбачыць трагедыю ўсяго чалавецтва — адна завершаная думка, якая ўвасоблена ў матэрыяле лаканічна і ў той жа час канкрэтна, ператвараецца ў аўтара ў эпічна маштабны твор.

Трагедыя знішчанай вёскі паўстае перад намі ў фігуры забітай у час уборкі ўраджаю жанчыны («Апошняе жніво»), дзе ўражвае ненармальнасць той сітуацыі, якая ўзнікла на фоне мірнай сельскай працы. Грубая матэрыяльнасць жаночай фігуры ў другой кампазіцыі («Дарогамі вайны») напаўняе сэрца крыўдаю і болем за скалечаныя і пераламаныя лёсы людзей. Тыя ж пачуцці нараджае маленькая фігурка схуднелага хлопчыка, у звычайнай дзіцячай гульні якога з усёй сілай адбіваецца вялікая трагедыя вайны («Гульня»).

Эмацыянальнай выразнасці твораў скульптар дасягае ў многім дзякуючы неадназначнасці трактоўкі тэмы, спалучэнню розных адценняў пачуццяў — да кожнага твора ён падыходзіць як да пэўнай жыццёвай сітуацыі. Кампазіцыя «Непераможныя» пазбаўлена традыцыйнай прамалінейнасці ў адлюстраванні воінаў-пераможцаў. Рама вагоннага праёма фарміруе мікраасяроддзе кампазіцыі, у якой адсутнічае дзеянне, падкрэслівае суровую штодзённасць абставін, якой адпавядаюць і настрой салдат. І ў гэтай атмасферы нараджаецца адчуванне ўнутранай сілы, нічым, здаецца, не выдатных людзей, якія паглыблены ў свой невясёлы роздум. І невыпадкова твор названы менавіта так — «Непераможныя».

Бясконцую разнастайнасць складаных ракурсаў, якія дэманструюць пластычныя магчымасці чалавечага цела, паказаў аўтар у графічных штудыях. І тут жа мы бачым, як у скульптурных фігурах гэта пластыка цел становіцца сродкам выяўлення пэўнага эмацыянальнага стану, пластычная выразнасць пераўтвараецца ў выразнасць эмацыянальную. «Радасць», «Смутак», «Бераг», «Флора», «Пачатак», «Ноч», «Асенняя песня» — у гэтых вобразах вар'іруюцца тонкія адценні чалавечай душы.

Паказальна, што эмацыянальным цэнтрам экспазіцыі стала кампазіцыя «Рэха», якую можна разглядаць як метафару ўсёй творчасці мастака — у гэтым паэтычным вобразе ўвасоблена накіраванасць як да людскіх сэрцаў, патрэба знайсці ў іх водгук.

Ала ШАМРУК.